І.А.Алексніна, *ст.выкладчык*

# АСАБЛІВАСЦІ АРГАНІЗАЦЫІ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ У ПРАЦЭСЕ СПАСЦІЖЭННЯ ПРАФЕСІІ РЭЖЫСЁРА

Кожнага выкладчыка спецыяльных дысцыплін хвалюе пытанне, як "разбудзіць" творчую прыроду студэнта, навучыць яго больш часу прысвячаць будучай прафесіі. Чым больш



БИБЛИОТЕКА БГУКИ

высокія патрабаванні прад'яўляюцца жыццём да выпускнікоў (якія сёння, дарэчы, пакідаюць сцены універсітэта не толькі як рэжысёры, але і як арганізатары тэатральнай творчасці і выкладчыкі спецыяльных дысцыплін), тым менш вучэбных гадзін адводзіцца студэнту на спасціжэнне прафесіі. Недаравальна і тое, што пашырэнне цыклаў агульнаадукацыйных і гуманітарных прадметаў выклікае значнае скарачэнне гадзін на спецдысцыпліны. Пакуль нашы вучэбныя праграмы яшчэ не да канца ўдасканаленыя, яшчэ патрабуюць дапрацоўкі, неабходна шукаць шляхі для найбольш прадуктыўнай арганізацыі працэсу самастойнай работы студэнта-будучага рэжысёра.

Практыка паказала, што многія выпускнікі займаюцца педагагічнай дзейнасцю, выкладаюць у школах, гімназіях, ліцэях спецыяльныя тэатральныя дысцыпліны. На наш погляд, выкладанне тэатральнай педагогікі патрабуе больш сур'ёзнага падыходу і больш уважлівага разгляду. Спадзяёмся, што ў хуткім часе гэта пытанне будзе абмяркоўвацца ў нашай ВНУ або акадэміі мастацтваў і прынясе плён.

А цяпер звернемся да асаблівасцей арганізацыі працэсу самастойнай работы студэнтаў, будучых рэжысёраў.

Існуе даволі ўстойлівая думка, што рэжысура — гэта прафесія, якой навучыць нельга, а навучыцца можна. У гэтым, безумоўна, ёсць доля праўды. Не менш рацыянальнай падаецца нам і пункт гледжання К.С.Станіслаўскага аб тым, што "... стварыць рэжысёра нельга — рэжысёр нараджаецца. Можна стварыць спрыяльную атмасферу, у якой ён можа вырасці" (Станиславский К.С. Статьи. Речи. Беседы. Письма. — М., 1953. — С. 655). Рэжысура, як і іншая творчая прафесія, патрабуе пастаяннай і бесперапыннай работы над сабой. Таму перад выкладчыкамі кафедры тэатральнай творчасці паўсталі дзве першачарговыя праблемы: як стварыць такую атмасферу, у якой студэнт мог бы навучыцца будучай прафесіі, і як абудзіць яго

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

творчыя сілы і накіраваць у патрэбнае рэчышча яго творчую фантазію, спрыяць станаўленню светапогляду будучага мастака.

Значная роля ў вырашэнні гэтых праблем належыць правільна арганізаванаму вучэбнаму працэсу, прафесіяналізму выкладчыкаў і іх асабістаму прыкладу не толькі ў аўдыторыі, але і за яе межамі. Кожны выкладчык павінен пастаянна павышаць свой "адукацыйны цэнз", наведваць выставы, спектаклі, канцэрты і абмяркоўваць убачанае са студэнтамі.

Важнымі, на наш погляд, з'яўляюцца і адносіны выкладчыка да студэнта. Быць высокаадукаваным прафесіяналам сёння недастаткова. Неабходна валодаць велізарным цярпеннем, увагай да ўсіх і кожнага. Прафесія выкладчыка патрабуе ад нас чалавечнасці, веры ў студэнта і нават любві да яго. Прычым гэтыя любоў і вера не павінны ніяк вылучаць лепшых студэнтаў і зневажаць менш здольных. Кожны студэнт павінен адчуваць, што ў яго вераць, на яго спадзяюцца і аднакурснікі, і педагог. Гэта стане вельмі моцным штуршком для актывізацыі самастойнай работы навучэнцаў.

Нельга гаварыць аб арганізацыі працэсу самастойнай работы студэнтаў-рэжысёраў без стварэння ўмоў для такой работы. На сённяшні дзень аўдыторый не хапае не толькі для самастойных рэпетыцый студэнтаў, але і для групавых заняткаў.

І, галоўнае, мастацкім кіраўнікам і куратарам неабходна трымаць самыя цесныя сувязі з прафесійнымі калектывамі і рэжысёрамі не толькі ў час праходжання практыкі студэнтамі, а пастаянна. Гэта аблегчыць працаўладкаванне выпускнікоў пасля заканчэння ВНУ, а таксама павысіць зацікаўленасць студэнта ў набыцці прафесійных ведаў і навыкаў як у працэсе спасціжэння рэжысёрскай прафесіі, так і самастойнай работы.

Адна з асаблівасцей спасціжэння рэжысёрскай прафесіі заключаецца ў тым, што яе аснова — гэта самастойная работа студэнта. Важна за гады навучання набыць уменні правільна

арганізоўваць свой вольны час, дысцыплінаваць сябе, прывучаць да пастаяннай і бесперапыннай работы над сабой. Вучэбны працэс грунтуецца сёння прыкладна на 80% з самастойнай работы студэнта-будучага рэжысёра. Яна ўключае і практыкаванні, і эцюды на "памяць фізічных дзеянняў", развіццё ўвагі, назіральнасці і іншых якасцей, якія неабходны рэжысёру. Самастойнай работы патрабуюць і стварэнне кінастужкі бачанняў на аснове літаратурных твораў, жывапісу, музыкі, "гульні з рэчамі", практыкаванні на жанры, эцюды на арганізацыю сцэнічнай прасторы, акцёрскі трэнінг, практыкаванні па сцэнічнай мове аж да распрацоўкі пастановачнага плана дыпломнага спектакля і яго практычнага ўвасаблення.

Хацелася б звярнуць увагу на практыкаванні, якія садзейнічаюць актывізацыі самастойнай работы студэнта, дапамагаюць дысцыплінаваць яго, развіваюць назіральнасць, паскараюць працэс актывізацыі ўвагі, робяць яго мэтанакіраваным, папаўняюць веды аб жыцці (што асабліва важна, таму што 97% студэнтаў-рэжысёраў — учарашнія школьнікі) і, акрамя таго, даюць магчымасць педагогу кантраляваць увесь працэс самастойнай работы студэнта.

Хочацца звярнуць увагу на вядзенне дзённіка назіранняў. На жаль, не многія педагогі, а тым больш студэнты разумеюць яго значнасць. Аднак, як пацвярджае практыка, вядзенне рэгулярных запісаў з боку студэнта і рэгулярны (але ні ў якой ступені не настойлівы) кантроль з боку педагога — вельмі карысная справа. Вядзенне дзённіка вымушае быць больш уважлівым да навакольнага свету, аналізаваць тыповыя і індывідуальныя рысы характару чалавека, яго пачуцці, інтанацыю, міміку, жэсты, пластыку, касцюмы, манеры, звычкі, а таксама мізансцэны, стыхійна ўзнікаючыя дыялогі і інш. Вядзенне дзённіка спрыяе вывучэнню дзеяння як адзінага псіхафізічнага працэсу, накіраванага на дасягненне пэўнай



БИБЛИОТЕКА БГУКИ

мэты, прывучае да аналізу ўчынкаў і іх матываў, задач, мэт, вынікаў, вучыць выказваць свае адносіны да той ці іншай падзеі. Тут важна імкнуцца да лаканічнага, канкрэтнага вобразна-пачуццёвага апісання ўбачанага ў рэальнасці.

Не менш важна выкарыстоўваць назапашаны матэрыял у эцюдах, міні-спектаклях, акцёрскіх і рэжысёрскіх расказах і паказах, мэтай якіх стане сцэнічнае ўвасабленне ўзятага з жыцця сюжэта з яго дзеяннем, звышзадачай, канфліктамі, прапанаванымі абставінамі, мізансцэнамі, падзеямі. У гэтых паказах, як у люстэрку, адлюстроўваецца ўвесь працэс самастойнай работы студэнта. Прычым вядзенне такіх дзённікаў не павінна абмяжоўвацца толькі першымі семестрамі навучання, а працягвацца да заканчэння вучобы, прычым запісы робяцца рэгулярна.

Актывізуе самастойную работу студэнтаў так званы творчы зачын. Ён адначасова садзейнічае развіццю навыкаў дысцыплінаванасці, адказнасці, увагі, назіральнасці, фантазіі, уяўлення, а таксама стварэнню творчай атмасферы, фарміраванню калектыву. Сутнасць яго заключаецца ў тым, што кожны студэнт па чарзе атрымлівае заданне падрыхтаваць і паказаць рэжысёрскі эцюд на любую тэму (напрыклад, “Рынак”, “Футбол”, “Магазін”; “Русалкі”, “Рыбкі”, “Камяні”, “У гасцях у казкі”, “На дне марскім” і інш.), але з адной умовай — трэба заняць увесь курс. Такія “зачыны” паказваюцца на кожных занятках, з іх, па сутнасці, і пачынаецца работа. Каб растлумачыць аднакурснікам заданне, студэнт павінен добра яго прадумаць, затым за некалькі хвілін да пачатку заняткаў прывесці курс “у рабочы стан” шляхам правядзення акцёрскага трэнінгу і “паставіць” свой “міні-спектакль”.

Названыя практыкаванні добра вядомы ў педагагічнай практыцы падрыхтоўкі рэжысёраў, але, на наш погляд, недастаткова шырока прымяняюцца ў практычнай дзейнасці. Трэба падкрэсліць, што самай галоўнай асаблівасцю ў



БИБЛИОТЕКА БГУКИ

самастойнай рабоце са студэнтамі-будучымі рэжысёрамі з'яўляюцца менавіта стварэнне і захаванне той атмасферы, у якой "нараджаецца рэжысёр".

БИБЛИОТЕКА БГУКИ